УДК 373.31

# СВЯТЫ І АБРАДЫ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Аспірант Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка
Навуковы кіраўнік – Турчанка Ірына Аляксееўна
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў выклікае неабходнасць пошуку новых сродкаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *фальклор, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, святы, традыцыі, звычай, абрад, купальскі квэст.*

Фальклор – гэта складанае, цесна звязанае з народным побытам, уяўленнямі і вераваннямі сінтэтычнае мастацтва, дзе спалучаюцца слова, музыка, тэатральнае дзеянне і танец. Фальклор кожнага народа інтэгруе культуру сваёй этнічнай групы на асаблівым этапе гістарычнага развіцця грамадства і таму з'яўляецца прадметам вывучэння не толькі такіх навук як мастацтвазнаўства, фалькларыстыка, этналогія, філалогія, але і гісторыя, псіхалогія і педагогіка.

Каштоўнасць фальклору як педагагічнага сродку вызначаецца натуральным, беспрымусовым уздзеяннем на дзяцей, даступнасцю для дзяцей з розным узроўнем развіцця, стымуляваннем развіцця творчых здольнасцей асобы.

Разгледзім святы і абрады, як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, якую мы вызначаем, як практычнае валоданне малодшымі школьнікамі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці ў розных сітуацыях зносін на аснове набытых моўных ведаў і сфарміраваных камунікатыўных уменняў [1].

Святы – гэта «… найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры» [2, с. 23] кожнага народа, праз якія «…адзначаюцца тыя ці іншыя моманты ў стане прыроды ці ў асабістым жыцці» [2, с. 23], дзе цесна параплятаюцца традыцыі, звычаі, абрады. Размяжуем дадзеныя паняцці.

Традыцыі і звычаі валодалі асаблівай сілай выхаваўчага ўздзеяння ў сістэме народнай педагогікі. Многія з іх перажылі сотні пакаленняў.

Традыцыі (от лат. traditio – перадача, паданне) ў шырокім значэнні трактуецца як «… спосаб быцця і ўзнаўлення элементаў сацыяльнай і культурнай спадчыны, які фіксуе ўстойлівасць і пераемнасць вопыту пакаленняў, часоў і эпох» [3], «… тое, што перайшло ад аднаго пакалення да другога, што атрымана ў спадчыну ад папярэдніх пакаленняў» [4, с. 2026]. Функцыі трацыцый заключаны ў захоўванні ўзораў і навыкаў дзейнасці, якія гістарычна назапашаны ў культуры этнасу, і перадачы гэтых ведаў маладому пакаленню з дапамогай звычаяў, абрадаў, тэкстаў і знакаў. У больш вузкім значэнні традыцыя – гэта «… парадак, які ўсталяваўся ў паводзінах, у побыце» [4, с. 2026] пэўнага этнасу – народная традыцыя. Спецыфічнымі рысамі народных традыцый з'яўляюцца даўгавечнасць, устойлівасць і трываласць.

Звычай разумеецца як «… правілы паводзін, якія традыцыйна ўсталяваліся» [4, с. 1098] у грамадстве, як «стэрэатып», які пастаянна паўтараецца [5]. Даследчыкі называюць звычаем выпрацаваныя з часам паводзіны народа пад час якіх-небудзь падзей. Звычай, які захоўваецца стагоддзямі, становіцца традыцыяй.

Механізм перадачы традыцый і звычаяў прадугледжвае камунікацыю паміж суб’ектам і аб’ектам, успрыманне, запамінанне, паўтарэнне і аднаўленне культурнай інфармацыі і, у выніку, стварае ўмовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Такім чынам, традыцыі і звычаі з’яўляюцца сацыяльным механізмам духоўнай пераемнасці пакаленняў. У якасці сродку фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў, яны ствараюць ўмовы для развіцця маўлення, спрыяюць засваенню сацыяльнага вопыту зносін, маюць простую форму камунікацыі.

Абрад – гэта «… комплекс дзеянняў, абумоўленых той ці іншай з’явай у прыродзе, станам яе або ўзростам чалавека»[2, с. 23], праз якія ўвасабляюцца бытавыя ці рэлігійныя традыцыі. Абрады разам з традыцыямі і звычаямі складаюць аснову святочнай культуры. Яны ўтвараюць народнае свята, з’яўляючыся яго часткай побач з песнямі, танцамі, гульнямі і тэатралізаванымі дзеяннямі. На сёняшні дзень калянларныя і сямейныя абрады страцілі сваё магічнае значэнне і пераўтварыліся ў «традыцыйныя святочныя забаўкі» [2, с. 104], пры гэтым не страціўшы функцыю выхавання маладога пакалення. Так, спасцігаючы культуру свайго народа, дзіця засвойвае родную мову, а разам з гэтым яшчэ мноства паняццяў, стэрэатыпаў, пачуццяў і вобразаў. Аднаўленне абрадаў у дзіцячых калектывах стварае ўмовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, паколькі ў працэсе творчай актыўнай дзейнасці праз узнаўленне тэкстаў развіваюцца слуханне і гаварэнне, засваюцца выканаўчыя каноны маўлення. Акрамя таго, такая дзейнасць развівае навучэнцаў творча, знаёміць з культурай народа і яго духоўным абліччам.

Такім чынам, абрад – гэта частка святочнага дзеяння, устаноўленага звычаем, функцыя якога на сёняшні дзень заключана ў захаванні культурнай спадчыны. З пазіцыі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі абрад можа разглядацца як тэатральная дзейнасць, накіраваная на фарміраванне маўлення.

У сучаснай школе на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі работа настаўніка са святамі і абрадамі накіраваная на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі можа ажыццяўляцца ў пазакласнай дзейнасці і быць разнастайнай:

1. *Разбор і абмеркаванне.* Работа з абрадам заўсёды пачынаецца са знаёмства з ім, абмеркавання і аналізу яго значэння.

2. *Творчая праца*. Маляванне, падрыхтоўка праектаў самастойна або з бацькамі. Такая праца развівае вучня, усталёўвае сувязь мінулага з сучаснасцю, спрыяе ўзаемадзеянню з дарослымі і з аднагодкамі, аб’ядноўвае.

3. *Драматызацыя*. Інсцэніроўка абрадаў або іх фрагментаў дапамагае развіваць гаварэнне і творчыя здольнасці дзяцей, развівае ўменне працаваць у групах, арыентавацца ў партнёрах і сітуацыях зносін.

4. *Расповяд – паказ.* Пазакласнае мерапрыемства для бацькоў, дзе дзеці разам з настаўнікам аднаўляюць, расказваюць і паказваюць які-небудзь абрад, традыцыі ці звычай.

5. *Квэст.* Правядзенне гульні з інтэрактыўнымі, спаборніцкімі, інтэлектуальнымі заданнямі на тэму беларускіх народных святаў і абрадаў.

У якасці прыклада такой работы разгледзім больш падрабязна купальскі квэст «У пошуках папараць-кветкі» [6].

**Квэст «У пошуках папараць-кветкі»**

***Мэта*** – абагульненне ведаў пра традыцыйнае народнае свята «***Купалле***».

***Задачы***: развіваць маўленне і пашыраць слоўнікавы запас вучняў; пашыраць уяўленні дзяцей аб традыцыйных беларускіх святах; выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа.

***Абсталяванне і матэрыялы***: дадатак 3; прызы для ўдзельнікаў, цукеркі; таблічкі з назвамі станцый; суправаджальныя карты для груп; рэчы для заданняў: аркушы паперы, алоўкі, кветкі, зеляніна, красворд, дровы, крапіва, пальчаткі, вянок, тэкст з правіламі гульні «У русалку», малюнкі з выявамі раслін: васілёк, рамонак, крапіва, канюшына, званочак, мацярдушка, цімафееўка, мята.

Перад пачаткам квэста, неабходна прадумаць месца размяшчэння «***станцый***», на якіх удзельнікі будуць выконваць свае заданні і маршрут, па якім будуць рухацца групы, не

перасякаючыся адзін з адным. Дзеці дзеляцца на групы і выбіраюць капітанаў. Акрамя таго ў кожнай групе патрэбен быць адзін дарослы, які будзе суправаджаць іх і, пры неабходнасці, аказваць дапамогу ў выкананні заданняў.

Мэта квэста – пошук папараць-кветкі. Кожная група павінна будзе прайсці сем станцый і выканаць сем заданняў. Тая група, якая першай яе знойдзе, і будзе пераможцай.

Капітаны каманд атрымоўваюць суправаджальную карта з планам мясцовасці, якая дапаможа адшукаць патрэбныя станцыі (малюнак 1).




**Малюнак 1. – Прыклад суправаджальнай карты**

На кожнай з групы чакае кіраўнік станцыі, які расказвае, якое заданне неабходна выконваць. На выкананне кожнага задання даецца па 10 хвілін, за выкананне якога кіраўнік станцыі зафарбоўвае на карце адзін пялёстак і піша «сваю» літару. А яшчэ ён указвае куды неабходна ісці далей.

Кожная група праходзіць станцыі па сваім маршруце.

***Станцыя «Чырвоная».*** На станцыі падрыхтаваны аркушы паперы і алоўкі.

*Заданне:* неабходна ўспомніць і запісаць галоўныя сімвалы Купалля, а таксама расказать пра адзін з іх.

Калі заданне выканана, то размалёўвае адзін пялёстак ***чырвоным*** колерам піша на ім літару ***Ь***, калі заданне не выканана, то літара не пішацца.

***Станцыя «Ружовая».*** На станцыі падрыхтаваны кветкі і зяляніна.

*Заданне:* сплесці купальскі вянок.

Калі заданне выканана, то кіраўнік размалёўвае адзін пялёстак ***ружовым*** колерам піша на ім літару ***Ц.***

***Станцыя «Сіняя».*** *На станцыі падрыхтаваны красворд і алоўкі.*

*Заданне*: разгадаць красворд.

1. Папараць – …
2. Хто звычайна плёў вянкі?
3. У якім месяцы святкуюць Купалле?
4. Гарачы сімвал свята.
5. Галоўны сімвал свята.




Калі заданне выканана, то кіраўнік размалёўвае адзін пялёстак ***сінім*** колерам піша на ім літару ***Я***.

***Станцыя «Жоўтая».*** *На станцыі падрыхтаваны дровы, крапіва і пальчаткі.*

*Заданне:* скласці купальскае «вогнішча».

Праз 10 хвілін кіраўнік глядзіць як складзена «вогнішча», потым уключае запіс купальскай песні і дзеці скачуць праз «вогнішча».

Калі заданне выканана, то кіраўнік размалёўвае адзін пялёстак ***жоўтым*** колерам піша на ім літару ***В***.

***Станцыя «Фіялетавая».*** На станцыі падрыхтаваны малюнкі з выявамі наступных раслін: васілёк, рамонак, крапіва, канюшына, званочак, мацярдушка, цімафееўка, мята.

*Заданне:* з тых малюнкаў, што ляжаць на стале, выбраць малюнкі з лекавымі раслінамі і назваць іх.

Калі заданне выканана, то кіраўнік размалёўвае адзін пялёстак ***фіялетавым*** колерам піша на ім літару ***Е***.

***Станцыя «Аранжавая».*** На станцыі падрыхтаваны тэкст с правіламі гульні «У русалку» і вянок.

*Заданне:* прачытаць правілы гульні ***«У Русалку»***, а потым расказаць і паказаць як у яе гуляць.

*Гульня «У Русалку»: Русалкай выбіралі самую смелую дзяўчыну, распускалі ёй валасы і ўпрыгожвалі вянком. Пасля праводзілі русалку ў кола і ўцякалі ад яё, а яна спрабавала каго-небудзь злавіць.*

Калі заданне выканана, то кіраўнік размалёўвае адзін пялёстак ***аранжавым*** колерам піша на ім літару ***З***.

***Станцыя «Зялёная».***

*Заданне:* успомніць і расказаць мне пра правілы паводзін пад час святкавання Купалля.

*Правілы паводзін: На Купалле трэба хадзіць толькі з дарослымі. Нельга блізка падыходзіць да вогнішча. Нельга блізка адыходзіць далёка ад бацькоў, лепей трымаць іх за руку. Нельга блізка падыходзіць да вады.*

Калі заданне выканана, то кіраўнік размалёўвае адзін пялёстак ***зялёным*** колерам піша на ім літару ***Д***.

Удзельнікі групы складаюць з літар **Ь, Ц, Я, У, Е, З, Д** кодавае слова «**ДЗЕВЯЦЬ**». Пад гэтым нумарам на карце пазначана месца, дзе схавана папараць-кветка.

Удзельнікі, якія прайшлі ўсе станцыі і разгадалі кодавае слова, прыходзяць да месца, пазначаную на карце нумарам дзевяць. Тая група, якая прыйшла першай, прызнаецца пераможцам квэста. У нагараду ім дастаюцца памятны прыз і цукеркі, а астатнім удзельнікам – суцяшальныя прызы.

Такім чынам, на прыкладзе купальскага квэсту мы разгледзелі магчымасці выкарыстання беларускіх народных святаў як сродку фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Святы і абрады змяшкаюць у сябе моўны і маўлечы матэрыял, вывучэнне якога спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, пашырае ўяўленняў дзяцей аб традыцыйных беларускіх святах і робіць заняткі цікавымі і творчымі.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ГР1209).

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Мурашка, Н. У. Сутнасць маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі: тэарэтычныя аспекты / Н. У. Мурашка // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. – 2023. – № 04. – С. 3–7.

2. Ліцьвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – 3-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 188 с.

3. Новая философская энциклопедия [Электронный ресурс] : Интернет-версия издания: Новая философская энциклопедия: в 4 т. / Институт философии РАН; Национальный общественно-научный фонд; Председатель научно-редакционного совета В.С. Степин. – 2-е изд., испр. и допол. – М. : Мысль, 2010. // Электронная библиотека ИФ РАН – Режим доступа : https://iphlib.ru/library/collection/newphilenc/document/HASH0139aae275501c6d82199339. – Дата доступа: 02.11.2023.

4. Толковый словарь русского языка : около 100 000 слов, терминов и фразеологических выражений / С. И. Ожегов ; под общ. ред. Л. И. Скворцова. – 28-е изд., перераб. – М. : Мир и Образование : ОНИКС, 2020. – 1375 с.

5. Большой энциклопедический словарь : энциклопедия / гл. ред. А. М. Прохоров. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Большая Рос. Энцикл., 2004. – 1456 с.

6. Мурашка, Н. У. Выхаванне і навучанне фальклорам на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў сучаснай школе на прыкладзе традыцыйнага свята «Купалле» / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. – 2020. – № 5. – С. 47–55.